УДК 882.6(091)-04

**Ю.А. Шчука**

# Вобраз нацыянальнага інтэлігента ў тэтралогіі Вячаслава Адамчыка

Чатыры раманы беларускага празаіка Вячаслава Уладзіміравіча Адамчыка (1933–2001), у якіх ён з глыбокім веданнем і па-майстэрску раскрыў тэму жыцця сваёй Радзімы – Заходняй Беларусі («Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца», «Голас крыві брата твайго»), ужо сталі лічыцца класікай беларускай прозы. Ва ўсіх іх прысутнічае вобраз хлопца – жыхара вёскі Верасава Міці Корсака, які на працягу сюжэтнага ходу сталее, фарміруецца як інтэлігент, праходзячы нялёгкі шлях змагання за шчасце сваёй зямлі і яе народа. Менавіта пра яго, а таксама пра іншых інтэлігентаў, вобразы якіх створаны В. Адамчыкам, пойдзе гаворка ў гэтым артыкуле.

Тэма фарміравання народнай інтэлігенцыі ў беларусаў, якое адбылося ў першай палове XX стагоддзя, у беларускай літаратуры раней ужо глыбока распрацоўвалася Якубам Коласам (трылогія «На ростанях»), Максімам Гарэцкім (апавяданні першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя), Кузьмой Чорным (некаторыя раманы 30-х–40-х гадоў) і некаторымі іншымі пісьменнікамі. У творах гэтых аўтараў паказаны людзі, якія задумваюцца над лёсам свайго народа, спрабуюць асэнсаваць тыя складаныя падзеі, што адбываюцца на Беларусі ў пераломны час. Паколькі беларуская нацыя ў першай палове XX стагоддзя складалася пераважна з вясковых жыхароў, то заканамерна, што першыя беларускія інтэлігенты паходзілі з вёскі, узрасталі «на вясковай глебе».

Закладзеныя славутымі майстрамі літаратуры традыцыі ўспрыняў і ўзбагаціў В. Адамчык. Аднак яго тэтралогію вылучае ў шэрагу твораў на аналагічную тэму тое, што інтэлігент паказаны на працягу свайго жыцця ад дзяцінства і да смерці, а таксама падрабязна разгледжаны абставіны і ўмовы, якія фарміруюць характар чалавека. Інтэлігенцыя ў тэтралогіі выглядае актыўнай грамадскай сілай, якая значна ўплывае на іншых людзей. Адносна вызначэння паняццяў «інтэлігенцыя», «інтэлігент» можна прыняць пункт гледжання акадэміка Д.С. Ліхачова, які лічыў, што «интеллигент – это представитель профессии, связанной с умственным трудом (инженер, врач, ученый, художник, писатель), и человек, обладающий умственной порядочностью» [1]. Д.С. Ліхачоў таксама адзначаў: «Интеллигент – это человек «особой складки»: терпимый, легкий в интеллектуальной сфере общения, не подверженный предрассудкам» [1].

Міця Корсак, як нам падаецца, на ўсіх этапах сваёй біяграфіі валодаў такой прыстойнасцю, якая выражалася найперш у адданасці інтарэсам свайго беларускага народа, шчырым жаданні працаваць дзеля яго, што і дало падставу лічыць яго інтэлігентам. У многіх працах, прысвечаных фарміраванню інтэлігенцыі ў Расіі (тут найперш маецца на ўвазе зборнік «Вехи», які ўключае працы М.А. Бярдзяева, П.Б. Струве, С.Л. Франка, С.М. Булгакава, М.А. Гершэнзона, А.С. Ізгоева, Б.А. Кісцякоўскага), адзначаецца таксама нятоеснасць паняццяў інтэлігентнасці і адукаванасці. Хаця адукацыя неабходная для чалавека, які можа і хоча стаць інтэлігентам, акрамя яе патрэбна яшчэ жаданне зрабіць штосьці сваё, новае і карыснае народу.

Як мы бачым ужо ў першым рамане В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына», з дзяцінства Міця валодаў вызначальнымі якасцямі характара, патрэбнымі для фарміравання інтэлігента, – рэфлектыўнасцю, аналітычнасцю, схільнасцю да роздуму. Гэтыя якасці вылучалі хлопца з ліку аднавяскоўцаў, аднак не адчужалі яго ад свайго акружэння, а хутчэй наадварот, давалі штуршок ягонай будучай дзейнасці на карысць народа. Апрача ўласцівага многім маладым роздуму над адносінамі людзей, якія знаходзіліся побач з ім, Міцю цікавілі і больш агульныя, глабальныя праблемы пабудовы грамадства, справядлівасці ў ім, прызначэння чалавека ў свеце. Тым асяроддзем, якое наводзіць на роздум, выпрацоўвае думкі, для галоўнага героя выступала родная прырода. У рамане «Чужая бацькаўшчына» ёсць унутраны маналог Міці, у якім можна бачыць пацвярджэнне гэтаму:

«Няўжо праўда, што ўсё гэта павінна змяніцца на зямлі – вёска, той далёкі лес, лапік стракатай руні на грудку, дзе на другое лета будзе палавець высокае, як троснік, і густое жыта, потым будзе адліваць золатам пруткае ржышча і пад восень на сонцы цяплом запахне свежая ралля. І гэтак бясконца. Бясконца будуць мяняцца людзі ў гэтай ціхай, што хаваецца за карычнявата-чорным прысаддзем, вёсцы.

А колькі іх змянілася ўжо. І ніхто не ведае, чым жыў, пра што думаў гэты даўнейшы чалавек. А ён жа таксама пераходзіў тут недзе кладку, глядзеў з грудка на вёску, радаваўся, што добра паўсходзіла рунь. Улетку аглядаў поле і быў davольны, што выпаў ураджайны год. А хто ведае гэтага чалавека?

Няўжо і я без ніякага следу павінен згінуць, растаць, як дым, у гэтым бясконцым свеце?» [2].

Такія глыбокія думкі служаць імпульсам для далейшага духоўнага самаўдасканалення героя, падштурхоўваюць яго да нейкіх высокіх учынкаў на карысць Радзімы і грамадства, праз якія можна выратавацца ад сыходу ў нябыт:

«Міцю ўзяла трывога, ахапіў страх, у нейкай звар'яцелай гарачыні завірылі, закружыліся, як глыбокая вада, яго мыслі: ён згіне, прападзе ў гэтым бясконцым свеце – і пасля яго не астанецца нічога. Няўжо гэта праўда? Няўжо? І ён, як за саломіну, хапіўся зноў за тое, што перадумаў раней, кожны раз сам-насам, стаіўшыся перад сном, – ён зробіць нешта вялікае на гэтай зямлі дзеля сябе і дзеля сваіх людзей, ён пойдзе ваяваць за іхнюю волю. Ён згіне, але яго будуць помніць. Чалавек павінен пакідаць пасля сябе памяць» [2].

Відавочна, што дзеля ажыццяўлення такой высокай мэты трэба было здзейсніць нейкі гераічны ўчынак: Міця ўжо з дзяцінства разумеў і адчуваў прыгнечанае становішча свайго народа, выкліканае адсутнасцю дзяржаўнай самастойнасці, таму каб упісаць сваё імя ў людскую памяць, на яго думку, было неабходна зрабіць нешта такое, што наблізіла б шчасце і ўсеагульную роўнасць. Шлях да шчаслівага жыцця бачыцца хлопцу праз асвету, праз далучэнне сваіх землякоў да культурных здабыткаў чалавецтва, а каб здзейсніць такое далучэнне, ён і сам мусіць стаць адукаваным. Акадэмік В.А. Каваленка ў артыкуле «Птах з падрэзанымі крыламі» з гэтай нагоды сказаў наступнае: «Міця ўжо прагне вялікай навукі і культуры, глыбокага пазнання свету, каб змяніць цяжкія сацыяльныя ўмовы існавання ўсяго народа. Людзі з такімі імкненнямі становяцца носьбітамі народнай і нацыянальнай свядомасці» [3]. У гэтым сэнсе польская школа хацяя і дала хлопцу багаж рознабаковых ведаў, да якіх ён так імкнуўся, аднак не выхавала ў Міці польскую свядомасць, як у некаторых іншых яго суайчыннікаў-заходнікаў, а паводле

прынцыпу «ад супрацьлеглага» скіравала яго да беларускасці, да беларускай культуры і мовы, якія былі больш блізкімі хлопцу. За свае прабеларускія погляды герой пачынае цярпець тады, калі трапляе ў польскі пастарунак, дзе асаблівую нянавісць у польскіх паліцыянтаў выклікае сшытак з беларускамоўнымі вершамі; гэты выпадак лішні раз пераконвае хлопца ў сваёй праваце, загартоўвае веру ў свой народ.

Істотна паўплывалі на Змітрыка і сямейныя ўмовы: народнае выхаванне, якое ён атрымаў ад бацькі (маці памерла вельмі рана), выклікала ў хлопчыка пачуццё еднасці з народам, адчуванне асабістай адказнасці за жыццё сваёй Радзімы, шчырае жаданне з поўнай самааддачай працаваць і жыць дзеля яе. Сям'я Корсакаў хоць і не была поўнай у звычайным разуменні, але Улас прыкладаў намаганні дзеля таго, каб захоўваць спрадвечныя нормы народнай маралі і прывіваць іх дзецям. У вёсцы хата Корсакаў адыгрывала ролю своеасаблівага інфармацыйнага цэнтра: Міця выпісваў газеты, а з Уласам часта прыходзілі параіцца старэйшыя мужчыны вёскі, лічачы яго пазіцыю важнай. Трэба, аднак, адзначыць, што Уласава дачка Алеся не толькі выходзіла замуж двойчы, але нават спрабавала загубіць сваё дзіця. Кожны член сям'і Корсакаў ужо вылучаецца з натоўпу, з шэрай масы, выглядае ў творы як самастойная асоба. Праз паказ Міцевай сям'і, ва ўмовах якой адбывалася фарміраванне характару галоўнага героя, Вячаслаў Адамчык сцвердзіў думку пра тое, што на асобу інтэлігента вызначальны ўплыў зрабіла народная мараль, увабраная будучым інтэлігентам са свайго асяроддзя. Гэты народны ўплыў – не толькі факт з асабістай біяграфіі Міці Корсака, але і асаблівасць фарміравання беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі ў цэлым (аналагічны падыход да інтэлігенцкай праблемы, на нашу думку, бачны ў творах М. Гарэцкага).

Відавочна, што складаныя сацыяльна-палітычныя ўмовы, якія мелі месца на Заходняй Беларусі ў першай палове XX стагоддзя, адбіліся на грамадскай пазіцыі галоўнага героя тэтралогіі. На гэты час ужо існавала сфарміраваная беларуская нацыя, але яе прадстаўнікі былі раз'яднаны штучна створанай мяжой. Частыя змены ўлады і супярэчлівыя звесткі пра жыццё ў Савецкай Беларусі выклікалі разгубленасць і неразуменне ў беларусаў-заходнікаў, якім было складана вызначыць свой лёс. Прымаючы гэта ўсё пад увагу, можна адзначыць, што фарміраванне народнай інтэлігенцыі ў беларусаў было ўскладнена. Першую магчымасць здзейсніць штосьці значнае і карыснае для людзей, наблізіцца да сваіх ідэалаў служэння народу Міця атрымаў з усталяваннем Савецкай улады. Хлопцу было складана разабрацца ва ўсіх тагачасных варунках, таму ён шчыра паверыў у перспектыўнасць новага грамадскага ладу і хутка ўключыўся ў працу мясцовага савета.

Аднак паступова стаўленне Змітрыка да новай улады мяняецца: на гэта паўплывала найперш адхіленне ад працы ў Дварчанскім валасным камітэце Лаўрына Царыка, даўняга Міцевага сябра, пазіцыя і справы якога былі вельмі блізкімі нашаму галоўнаму герою. Лаўрына можна назваць духоўным настаўнікам Міці: знаёмства з ім становіцца вызначальным у лёсе нацыянальна свядомага хлопца. Сімпатыі аўтара да гэтага персанажа праяўляюцца ўжо ў тым, што Царык чытае і вельмі высока цэніць Ф.М. Дастаеўскага. «Без яго, як без Бібліі, душу чалавечую не ведацьмеш», – сцвярджае Царык [4]. Сам В. Адамчык таксама вельмі цаніў Ф. Дастаеўскага – многія думкі вялікага рускага пісьменніка былі блізкія празаіку і знайшлі адлюстраванне ў яго творах. Можна параўнаць, да прыкладу, два наступныя выказванні: «Кто слишком любит человечество вообще, тот большею частию, мало способен любить чело-

века в частности» (Ф. Дастаеўскі) [5]; і афарыстычныя словы самога В. Адамчыка: «Хто вельмі ж шкадуе злачынцу (злодзея, забойцу і інш.), той вельмі часта не здольны пашкадаваць яго ахвяру» [5, с. 126]. Царык быў зменены на пасадзе старшыні Зояй Нікандравай, старой бальшавічкай, прысланай з Расіі, якая недаверліва і варожа ставілася да заходняга насельніцтва. Такім чынам, мары і спадзяванні, якія звязваў Корсак-малодшы з прыходам новага парадку, не спраўдзіліся: прадстаўнікі новай улады не клапоцяцца пра інтарэсы беларускага народа, а імкнуцца загнаць яго ў безагаворачнае падпарадкаванне бальшавіцкай адміністрацыі. Схільнасць да абдумвання ўсяго, што адбываецца навокал, рэфлектыўнасць прыводзіць яго да непрыняцця шмат якіх навацый Савецкай улады.

У чацвёртай кнізе тэтралогіі, дзе апісваецца прыход Другой сусветнай вайны на Беларусь, Міця зноў перажывае асабісты спад, які часова спыняецца толькі пасля вызвалення хлопца з турмы. Выцягнуў яго даўні знаёмы Костак Камашыла, ён жа потым аказаў яму вялікі давер, узяўшы ў сваю вайсковую беларускую часць, створаную з дазволу немцаў. Відавочна, што Костак таксама калісьці верыў у беларускую ідэю (тут можна прыгадаць эпізод з першай кнігі, дзе Міця сустрэў Камашылу на дарозе ў мястэчка, калі той ехаў вучыцца ў Віленскую гімназію, – усё ж там Костак атрымаў пэўны «зарад беларускасці»), але далейшае жыццё развяло гэтых персанажаў вельмі далёка. Аўтарскія характарыстыкі Камашылы пераважна адмоўныя. Сваёй фразай «Не, туды я не пайду... Як ужо ні будзе» [2, с. 90]. Міця падкрэслівае сваё стаўленне да фашысцкай акупацыі і ідэалогіі, якое сярод прадстаўнікоў тагачаснага беларускага народу было розным. Пачуццё адказнасці за свой народ і краіну, уласцівае інтэлігенту, а таксама несумяшчальнасць яго маральных прынцыпаў з тым, што даводзілася бачыць, чуць, рабіць у атрадзе Камашылы, не дазволілі Міцю ўвязацца ў сумнеўную справу.

У канцы чацвёртага рамана тэтралогіі Міця гіне: як вядома з кнігі, яго забівае мясцовы партызан Жэнік Рэпка. Гэта, на нашу думку, сімвалізуе наступленне на Беларусь самай страшнай і змрочнай навалы XX стагоддзя – Другой сусветнай вайны. Як ніколі раней беларусы падвяргаюцца смяротнай небяспецы: ім пагражае як фізічнае знішчэнне, так і справакаваны варожымі бакамі сусветнага канфлікту раскол нацыі, з-за якога аднавяскоўцы, равеснікі, суседзі апынаюцца на супрацьлеглых пазіцыях і забіваюць адзін другога. Адбываецца канчатковая дэзарыентацыя беларусаў, якія, знаходзячыся паміж двух агнёў, імкнуліся па магчымасці ратавацца, захаваць жыццё, але гэта слаба атрымлівалася. Паказаны Вячаславам Адамчыкам лёс нацыянальнай інтэлігенцыі, як і лёс усёй беларускай нацыі ў XX стагоддзі, выглядае вельмі трагічным: наш народ быў пазбаўлены незалежнасці, неаднаразовыя спробы дабіцца яе аказаліся няўдалымі, таму жыццё беларусаў заўсёды вырашалася па-за межамі Беларусі, і вырашалі яго людзі, далёкія ад беларускіх інтарэсаў. Пісьменнік таксама выражае думку, што інтэлігент у нашай краіне не толькі прысвячае сябе стварэнню і захаванню духоўнага вопыту народа, а вымушаны ахвяраваць сабой дзеля інтарэсаў нацыі, як і адбылося з Міцем Корсакам. Падкрэсліванню гэтай ідэі служыць натуралістычны паказ ваенных сцэн, дзе бачна непрыхаваная, а часам проста сляпая жорсткасць з боку ўдзельнікаў ваеннага канфлікту ў дачыненні да мірнага насельніцтва. Напрыклад, стаўленне фарміраванняў РОНА да мясцовых жыхароў выяўляецца праз адну кароткую фразу «Стрелять всех надо», кінутай ронаўцам, калі яго пазнаў на базары Міця Корсак. Не адставалі ад іх у жорсткасці і казакі: яны збівалі мяс-

цовых жыхароў проста «дзеля прафілактыкі», толькі за тое, што тыя трапіліся на іх шляху. Так пацярпеў стары Літавар, які ішоў у касцёл, гэтак жа атрымаў удары па галаве стары Корсак, бо не змог назваць мясцовых партызанаў. Відавочна, што такое стаўленне да народа не магло нармальна ўспрымацца інтэлігентам, выклікала ў яго цяжкі роздум. Найвялікшай асабістай трагедыяй, якая перавярнула ўсе інтэлігенцкія ўяўленні пра свет і людзей, стала для Міці смерць самага блізкага чалавека – бацькі Уласа Корсака, пасля якой у галоўнага героя нарадзіліся такія думкі: «Няўжо свет такі злы і нялітасцівы? Няўжо не было і няма ў ім дабра? І ён, Міця, дарма шукаў у ім справядлівасці, высокага чалавечага розуму, светлага кахання, дабраты паміж людзьмі. Няўжо ён так горка абмыліўся? Няўжо пануе толькі звярыны закон: ірваць адзін аднаго, трымаць у няволі, з асалодаю біць, рэзаць, заваёўваць, узвышацца адзін над адным, род над родам, нацыя над нацыяй, дзяржава над дзяржавай» [2, с. 258].

Падагульняючы сказанае вышэй, можна з упэўненасцю канстатаваць, што Вячаславу Адамчыку ў заходнебеларускай тэтралогіі ўдалося пераканаўча вырашыць пастаўленае ім інтэлігенцкае пытанне, дзякуючы чаму адной з вядучых ідэй твора стала сцверджанне той важнай ролі, якую адыгрывае гэтая сацыяльная група ў пабудове незалежнай краіны, у захаванні духоўнага вопыту народа. На жаль, намаганні інтэлігентаў кшталту Міці Корсака і Лаўрына Царыка не дасягнулі мэты: тагачасная грамадска-палітычная сітуацыя не дазваляла ніякага іншадумства, адступлення ад дырэктыўных нормаў рэвалюцыйнай лініі, таму асабісты лёс шчыра адданых Беларусі людзей аказваецца зламаным жорсткімі абставінамі. Важна яшчэ раз падкрэсліць, што наш народ у першай палове ХХ стагоддзя дасягнуў такога ўзроўню культурнага ўздыму, калі з яго глыбіняў ужо маглі ўздымацца інтэлектуальна актыўныя сілы, якія былі здольныя стаць «мозгам нацыі». Міцю можна лічыць менавіта нацыянальным інтэлігентам з той прычыны, што ён ва ўсе перыяды жыцця імкнуўся не адрывацца ад сваёй беларускай глебы, аддаваў усяго сябе працы на карысць народа.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Лецка Я.*** Хараство і боль жыцця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка. – Мн., 1985. – С. 505.
2. ***Адамчык В.*** Голас крыві брата твайго: Раман. Апавяданне. – Мн., 1991. – С. 78.
3. ***Вехи:*** Сборник статей о русской интеллигенции. (Репринтное воспроизведение издания 1909 года). – М., 1990. – С. 239.
4. ***Адамчык В.*** Чужая бацькаўшчына. – Мн., 1995. – С. 286.
5. ***Адамчык В.*** Старонкі з дзённікаў // Маладосць, 2003, № 7. – С. 125.



## *S U M M A R Y*

*In clause one of conducting themes of Viachiaslau Adamchyk's tetralogy – theme of intelligency is shined. The detailed analysis of an image of the tetralogy main hero Mitia Korsak is given during his vital ways in wide spatial-temporary context, and also by the way of development of the internal world of the hero.*


*Поступила в редакцию 2.03.2005*